ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987

18 ЧЭРВЕНЯ

ЧАЦВЕР

№ 22(1543)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

ТЭЛЕТАЙП

ВЕСТКІ • СПІНКІ • ЗАЎТРА

СА СПРАВАЗДАЧАЙ

аб ходзе летняй экзаменацыйнай сесіі 1986—1987 вучэбнага года на чарговым пасяджэнні рэктарата БДУ імя У. І. Леніна выступілі прадстаўнікі вучэбнага аддзела. На ім абмеркавана таксама пытанне аб выкарыстанні ўнікальнага і дарагога абсталявання ў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі і на фізічным факультэце універсітэта.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

ЛЕТНІ ПРАЦОЎНЫ

семестр хутка пачнецца ў байцоў студэнцкіх атрадаў. Аб тым, як у іх праходзіць падрыхтоўчы перыяд і ці гатовы яны да выезду на месцы дыслакацыі, ішла размова на апошнім пасяджэнні савета БДУ імя У. І. Леніна.

Разгледжаны некаторыя арганізацыйныя пытанні.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

НОВУЮ ПРАГРАМУ

рыхтуе да здачы мастацкаму савету фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш».

М. ТАРАСАВА, мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

ЧЭМПІЯНАТ БССР

па цяжкай атлетыцы прайшоў нядаўна. У саставе зборнай каманды г. Мінска ўдзельнічалі шэсць студэнтаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта. Найбольш паспяхова выступілі І. Зданоўскіс (геафак), які заняў другое месца, Д. Змушко (гістфак), В. Шаўчук (юрфак) — 4 месца. Два маладыя атлеты А. Макейчык і С. Буднік (фізфак) выканалі нарматывы майстроў спорту. Зараз Д. Змушко і І. Зданоўскіс рыхтуюцца да чэмпіяната СССР.

В. КАВАЛЁЎ, старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.

ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫ ВЕЧАР

«Жыццё, аддадзенае людзям», прысвечаны творчасці Уладзіміра Высоцкага — паэта, артыста, спевака, пройдзе сёння ў Доме культуры тэкстыльшчыкаў (пачатак у 19.30). Прысутным будзе дэманстравацца фільм «Успамін».

Ч. ВІКТАРАЎ.

X ТУРЫСТЫЧНЫ ЗЛЁТ

сабраў удзельнікаў зорных паходаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. У ім прымалі ўдзел 24 каманды прадпрыемстваў і навучальных устаноў Маскоўскага раёна. Каманду нашага універсітэта прадстаўлялі студэнты юрыдычнага факультэта. У 12 відах конкурсаў і спаборніцтваў каманда паказала выдатныя рэзультаты і ў выніку заняла першае месца.

С. БАЛАШЭНКА.

НАШ СУЧАСНІК

БЕЗ ТАЛЕНТУ людзей няма. Есць тыя, хто не знайшоў яшчэ свайго прызвання. Кожны чалавек мае нешта сваё, асабістае, такое, на што больш ніхто на свеце не здатны. І толькі калі ён адкрые ў сабе гэта «сваё», калі яно стане для чалавека галоўным у жыцці, толькі тады ён будзе па-сапраўднаму шчаслівым. Юля Мамантава, здаецца, сваё прызванне знайшла. Яна — студэнтка III курса факультэта прыкладной матэматыкі, вучыцца на добра і выдатна, актыўна ўдзельнічае ў прафсаюзнай рабоце.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

21 чэрвеня — дзень выбараў у мясцовыя Саветы

ТВОЙ ВОЛЬНЫ ЧАС

ЦІКАВА ПРАВОДЗЯЦЬ СВОЙ ВОЛЬНЫ ЧАС СТУДЭНТЫ ХІМФАКА, А ДАПАМАГАЕ ІМ У ГЭТЫМ АРГАНІЗАТАР ДОБРАГА НАСТРОЮ — СТУДЭНЦКІ КЛУБ «ЭКСПРОМТ».

— МАТОР! Пачалі! Буйны план! Стоп! Знялі.

Што гэта? Ідуць чарговыя здымкі новага фільма? Не, гэта працуе студэнцкі клуб. Тут няма кінааператара, нават камера несапраўдная — драўляная. Ды і прафесійных артыстаў таксама няма. Усё гэта робяць самі студэнты і нават не горш, чым у кіно.

Экспромтам пра «Экспромт»

Пытанні перабудовы вышэйшай школы, самакіравання, студэнцкага жыцця — гэтыя і іншыя праблемы цікавяць удзельнікаў клуба. Таму праз гумар, смех, укладзеныя ў вусны і рухі Атлантаў, піянераў, Раскольнікава і нават лялек, яны даносяць іх да гледача.

На ўсе нашы пытанні аб стварэнні клуба адказаў сакратар камітэта камсамола хімічнага факультэта Андрэй Акулік:

— Разумееце, надакучылі амаль аднолькавыя вечары, дыскатэкі. Хацелася чагосьці... незвычайнага. Аднойчы на пасяджэнні камітэта камсамола ўзнялі пытанне аб выкарыстанні вольнага часу студэнтамі. Падумалі і вырашылі арганізаваць студклуб. Удзельнічаць у новай справе запрасілі ўсіх жадаючых. А назва клуба прыйшла сама сабой — «Экспромт». Чаму? Таму, што арганізаваны ён быў таксама нечакана, экспромтам.

На базе «Экспромта» працуюць рок-група «Акварыумныя рыбкі» і рытм-група «Капрыз».

Пасля зімовага сну абуджаецца прырода. Іменна ў такі па-дзіцячаму капрызны веснавы дзень нарадзілася рытм-група «Капрыз».

— Дзяўчаты, якія ўваходзяць у групу, не маюць спецыяльнай харэаграфічнай адукацыі. Зараз іх восем,— расказвае кіраўнік Таццяна Загній, студэнтка IV курса хімфака.

— А ўсе жадаючыя могуць быць удзельнікамі групы?

— Не, аднаго жадання тут мала. Пры падборы кандыдатур звяртаем увагу і на знешнія якасці, і на здольнасці: трэба, каб чалавек не толькі хацеў, але і мог танцаваць.

Дзе танцаваць, дзяўчатам няма розніцы: ці то на сцэне, ці то на лесвіцы — усюды добра атрымліваецца. Можна доўга з зачараваннем глядзець на цудоўную пластыку рухаў самадзейных артыстаў рытм-балета. Робяць яны сваімі рукамі і касцюмы. Да асноўнай формы дадуць свой маленькі штрышок — і адразу атрымліваецца зусім іншы, святочны выгляд.

Не ўсё ў клубе так проста. Есць і свае праблемы. Адна з іх — папаўненне. Няма яго. Не дапамагаюць нават і маляўнічыя аб'явы. Адбіваецца на рабоце клуба і тое, што няма ў яго свайго памяшкання.

А пакуль «Экспромт» стаіць на першай прыступцы лесвіцы, па якой, спадзяёмся, будзе паступова падымацца ўгору.

Н. БАХІР,
Г. ПРЫГАРА,
студэнткі факультэта журналістыкі.

Першыя крокі «Мерыдыяна»

У красавіку гэтага года на аддзяленні міжнароднай журналістыкі факультэта журналістыкі выйшаў першы нумар насценнай газеты «Мерыдыян» — орган савета дружбы. У гонар гэтай падзеі прайшоў мітынг. Нараджэнне газеты віталі дэкан факультэта журналістыкі А. Г. Слука, загадчык аддзялення міжнароднай журналістыкі А. А. Рудэнка.

РАНЕЙ на нашым аддзяленні выходзілі толькі святочныя выпускі газеты. Напрыклад, да Новага года, 8 Сакавіка і г. д. Але з цягам часу гэта перастала задавальняць. Мы пачалі думаць аб пастаяннай газеце, у якой змаглі б друкаваць свае матэрыялы, вучыцца журналісцкаму майстэрству. На пасяджэнні рэдакцыйнай калегіі вырашылі стварыць газету «Мерыдыян». Праўда, вакол назвы доўга спрачаліся, было прапанавана шмат варыянтаў. І ўсё ж спыніліся на «Мерыдыяне». Аргумент быў просты: на нашым аддзяленні вучацца студэнты з 48 краін свету.

Першы нумар газеты вырашылі выпусціць да дня нараджэння У. І. Леніна. І гэта не выпадкова. На лекцыях, практычных занятках і семінарах нам пастаянна прыводзяць прыклады з жыцця і творчасці вялікага публіцыста.

Наша газета мае некалькі раздзелаў: краіназнаўства, літаратура і мастацтва, спорт, агляд пісьмаў, грамадска-палітычны. Ужо выйшлі тры нумары насценкі (спецыяльны выпуск быў прысвечаны Дню Перамогі). Загадчыца аддзялення А. А. Рудэнка неяк заўважыла, што яшчэ рана рабіць пэўныя вывады, але, параўноўваючы гэтыя тры нумары, бачым, што апошні выпуск адрозніваецца ад першых двух. Тут матэрыялы лепшыя і больш разнастайныя, ды і памер газеты павялічыўся.

З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, НАСЦЕНКА!

Вялікую дапамогу ў выпуску насценкі аказваюць дэканат (адвёў пакой у інтэрнаце № 2, дзе мы можам працаваць над газетай) і выкладчыкі рускай мовы (разам з намі рэдагуюць матэрыялы). Нядаўна на пасяджэнні рэдкалегіі зацверджаны план работы на верасень.

ТХАНАМ ІТ ПХАНІТЧАРАТ, студэнтка аддзялення міжнароднай журналістыкі

Наступны вучэбны год для вышэйшых навучальных устаноў краіны будзе адказным: у поўным аб'ёме рэалізуецца рэформа вышэйшай школы, якая патрабуе вырашэння цэлага комплексу задач. Сярод іх — удасканаленне вучэбнага працэсу ў плане набліжэння яго да сучаснай вытворчасці, замацаванне тэарэтычных ведаў на практыцы, развіццё самастойнай работы студэнтаў, павышэнне яе эфектыўнасці. У вырашэнні гэтых задач першаступенную ролю павінна адыграць студэнцкая навука.

СТУДЭНТ І НАВУКА

Ад цацкі — да адкрыцця!

ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ склалася сістэма шырокага прыцягнення студэнтаў да навукова-даследчай работы: удзел у выкананні гаспадарча-дагаворных і дзяржбюджэтных навукова-даследчых работ, функцыяніраванне студэнцкіх навуковых і тэхнічных гурткоў, навукова-даследчых лабараторый (СНДЛ), навукова-вытворчых атрадаў.

Поспехі студэнцкіх даследаванняў яскрава адлюстраваны ў выніках апошняга Усесаюзнага конкурсу на лепшую навуковую работу студэнтаў па грамадскіх, прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках, прысвечанага XXVII з'езду КПСС. З 237 работ студэнтаў нашага універсітэта, пададзеных на конкурс, 5 удастоены медалёў «За лепшую навуковую студэнцкую работу», 12 даследаванняў адзначаны дыпломамі МінВНУ СССР. Атрымалі высокія ацэнкі за свае работы студэнты: Нгуен Ван Хон, А. Левін (мехмат), Д. Мельнік (факультэт радыёфізікі і электронікі), А. Мядзведзеў (ФПМ), Т. Дрозд (геафак). Патрэбна дадаць, што сярод ВНУ краіны па колькасці ўзнагарод наш універсітэт абагналі толькі МДУ, Каўнаскі і Грузінскі політэхнічныя інстытуты.

Нягледзячы на гэтыя поспехі, у навукова-даследчай рабоце студэнтаў шмат праблем, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Адной з эфектыўных форм НДРС універсітэта з'яўляюцца студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі (СНДЛ). Зараз іх арганізавана 21, усе яны працуюць над канкрэтнымі народнагаспадарчымі задачамі па заказах прадпрыемстваў і ўстаноў. Можна прывесці шэраг прыкладаў эфектыўнай работы СНДЛ робататэхнічных сістэм кафедры кібернетыкі, СНДЛ метадаў і сродкаў апрацоўкі сігналаў кафедры радыёфізікі, СНДЛ кафедры землязнаўства. Распрацоўкі і рэзультаты даследаванняў гэтых лабараторый штогод укараняюцца з эканамічным эфектам ад 20 да 50 тысяч рублёў.

Аднак на працягу мінулага года рэзультатыўнасць дзейнасці СНДЛ значна панізілася: апублікавана 67 студэнцкіх работ (у 1985 г. — 70), атрымана станоўчых рашэнняў 7 (1985 г.— 12), эканамічны эфект ад укаранёных работ склаў 54,6 тысяч рублёў (1985 г. — 190 тыс. руб.). Гэта з'яўляецца вынікам тых цяжкасцей, з якімі сутыкаюцца СНДЛ.

Па-першае, патрэбна ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу лабараторый. За кароткі тэрмін гэту праблему можна вырашыць пры ўмове, што студэнцкія лабараторыі будуць працаваць па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы, ведучы самастойныя дагаворы або частку гаспадарчых дагавораў кафедры.

Па-другое, неабходна расшырыць плошчы студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый. Зараз іх відавочна недастаткова.

Па-трэцяе, неабходна ў рамках факультэтаў устанавіць фонд заработнай платы СНДЛ. У апошнія гады назіраецца тэндэнцыя яго скарачэння (у 1986 годзе ён складаў усяго 26 тыс. рублёў).

Па-чацвёртае, для павышэння ўзроўню навуковага кіраўніцтва студэнцкімі лабараторыямі неабходна ў максімальнай ступені заахвоціць выкладчыкаў. Гэта праблема можа быць вырашана, калі ў вучэбных планах выкладчыкаў будзе ўлічвацца навуковае кіраўніцтва студэнцкімі лабараторыямі і гурткамі.

Усе названыя моманты неабходна ўлічыць пры складанні новага палажэння аб СНДЛ, неабходнасць распрацоўкі якога ўжо абавязковая, таму што існуючае было прынята ў 1976 годзе.

Перспектыўнай формай заахвочвання студэнтаў да навуковай работы з'яўляюцца навукова-вытворчыя атрады, створаныя на фізфаку і факультэце радыёфізікі і электронікі ў рамках вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання «БДУ імя У. І. Леніна — ВА «Інтэграл». Зараз вядзецца інтэнсіўная работа па іх стварэнню на хімічным, механіка-матэматычным факультэтах, ФПМ. Але стварэнню і паспяховаму функцыяніраванню такіх атрадаў перашкаджае шэраг праблем, якія могуць быць вырашаны пры распрацоўцы адзінай нарматыўна-прававой дакументацыі, што рэгламентавала б работу атрадаў непасрэдна на прадпрыемствах. Такога тыпу дакументаў сёння няма.

Патрэбна таксама адзначыць, што з боку камітэтаў камсамола факультэтаў мала ўвагі ўдзяляецца навукова-вытворчым атрадам, праводзіцца недастатковая работа па заахвочванню студэнтаў да работы ў іх.

Магутным стымулам для развіцця маладзёжнай навуковай творчасці становіцца разгортванне адзінай агульнадзяржаўнай сістэмы НТТМ, цэнтрам якой павінны стаць гарадскія гаспадарча-разліковыя маладзёжныя навуковыя цэнтры. У рамках гэтых цэнтраў у вольны ад асноўнай работы час могуць працаваць маладыя вучоныя, інжынеры, тэхнічны персанал, студэнты. У Мінску маладзёжны навуковы цэнтр пачне функцыяніраваць з кастрычніка гэтага года, а камітэты камсамола студэнтаў і супрацоўнікаў вядуць зараз работу па стварэнню творчых маладзёжных калектываў для работы ў саставе цэнтра.

Яшчэ адна магчымасць для ўдзелу маладых супрацоўнікаў і студэнтаў у тэхнічнай творчасці адкрываецца ў сувязі з разгортваннем работ паміж БДУ імя У. І. Леніна і заводам «Калібр» па распрацоўцы тавараў народнага спажывання і дзіцячых электронна-механічных цацак. Для актывізацыі работ у гэтым напрамку камітэт камсамола арганізаваў конкурс па распрацоўцы электронна-механічнай цацкі. Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны пуцёўкамі за мяжу, а лепшыя распрацоўкі — рэкамендаваны для ўкаранення.

В. МАЛАФЕЕЎ.
намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па навуковай рабоце.

СБА: СТАРТ ДА ПРАЦЫ

Колькасць — 2280 студэнтаў. Месца дзеяння — г. Мінск, Мінская, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Смаленская, Пскоўская вобласці, Карэльская АССР, Архангельская вобласць, Сібір, а таксама Літоўская, Малдаўская, Казахская ССР, ГДР і НРБ.

Як вы ўжо здагадаліся, размова пойдзе пра студэнцкія будаўнічыя атрады. Пра тое, як рыхтуюцца байцы да трэцяга працоўнага семестра, расказвае старшыня штаба працоўных спраў універсітэта В. Бойка:

Лета — будзе...

— Новай перспектыўнай формай удзелу студэнтаў у працоўным семестры з'яўляюцца навукова-вытворчыя атрады, што арганізаваны на фізічным, хімічным, механіка-матэматычным, гістарычным факультэтах, ФПМ і факультэце радыёфізікі і электронікі. 105 студэнтаў розных факультэтаў аб'ядналі ў пяць камуністычных атрадаў.

Побач з савецкімі студэнтамі будуць працаваць 130 замежных. Упершыню ў гэтым годзе на юрыдычным факультэце створаны інтэрнацыянальны атрад. Яго байцамі стануць былыя воіны, якія выконвалі свой інтэрнацыянальны абавязак у ДРА, і афганскія студэнты, што прыехалі вучыцца ў Мінск.

Упершыню створаны і сумесныя атрады з ГПТВ-53 і ГПТВ-52, тэхнікумам будаўнічых матэрыялаў. Значыць 34 чалавекі з гэтых вучэбных устаноў прымуць удзел у працоўным семестры.

У час работы атрадаў будуць праводзіцца дні ўдарнай працы ў фонд будаўніцтва горада Гагарына і фонд саюзаў моладзі краін, якія развіваюцца, а таксама ў фонд 25-годдзя рэспубліканскага студэнцкага руху.

Вядома, што байцы многіх студэнцкіх будаўнічых атрадаў працуюць на «выдатна». Але ж казаць пра тое, што праблем тут няма, нельга.

Усе мы лічым, што будаўнічы атрад — справа добраахвотная. І ўсё ж цяжка зразумець тых, хто за пяць гадоў вучобы не знайшоў часу, каб папрацаваць на будаўнічай пляцоўцы. Такіх аматараў адпачынку мне, калі быць да канца сумленным, нават шкада, бо атрад — гэта школа станаўлення характару, школа самасцвярджэння, праверка на трываласць навыкаў арганізацыйнай работы. Згадзіцеся, усё гэта будучым маладым спецыялістам абавязкова спатрэбіцца.

Іменна ад камандзіраў і камісараў залежыць, якім будзе атрад. Толькі не кожны з іх клапоціцца аб жаданні байцоў працаваць, не ўсе з належнай увагай ставяцца да арганізацыйных пытанняў падрыхтоўчага перыяду. Адсюль і абыякавыя адносіны да сваіх абавязкаў з боку студэнтаў. Добраахвотна пішам заявы, абавязуемся выконваць Статут Усесаюзнага студэнцкага атрада. А што ж атрымліваецца на самай справе? На занятках па прафесійнай падрыхтоўцы байцы займаюцца рознымі справамі, толькі б не слухаць лекцый. Дрэнныя выкладчыкі? Тады чаму ніхто не прыходзіць за дапамогай у камітэт

камсамола? Адказ просты: нікога гэта не цікавіць.

Акрамя працы павінны займацца атрады і грамадска-палітычнай дзейнасцю. Выступленні агітбрыгад, лекцыі, работа з «цяжкімі» падлеткамі, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы... Чаму мы заўсёды забываем пра гэты бок дзейнасці атрадаў? Лічым, што яна ўжо адышла на другі план?

Турбуе і такое пытанне: калі ж скончыцца практыка накіравання байцоў атрадаў у арганізацыі, якія не падрыхтаваны да іх прыёму? Тут часцей за ўсё абвінавачваюць кіруючыя органы. Толькі ці не вінаватыя ў гэтым і самі камандзіры і камісары атрадаў. Яны ідуць на повадзе ў кіраўнікоў прымаючых арганізацый, спадзяюцца на абяцанкі: будзе ўладжана, з панядзелка пачнём, і дазваляюць марнаваць час. Я лічу, калі ў прымаючай арганізацыі няма магчымасцей падрыхтавацца да прыезду байцоў, патрэбна ставіць пытанне аб перадыслакацыі, як і адбылося з атрадамі «Рубін» юрыдычнага факультэта і «Аэліта» факультэта радыёфізікі і электронікі.

Добрая падрыхтоўка дапаможа дасягнуць добрых вынікаў. Давайце ж клапаціцца аб гэтым загадзя.

ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

«Антыбрава»

НА АРТЫКУЛ «АНТЫБРАВА», ЗМЕШЧАНЫ Ў ГАЗЕЦЕ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» (№ 20 АД 4 ЧЭРВЕНЯ ГЭТАГА ГОДА), АДКАЗВАЕ САКРАТАР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА А. ЖУК:

«Бюро камітэта камсамола разгледзела артыкул «Антыбрава», у якім ішла гаворка пра вечар «Музычны рынг», што праводзілі камітэт камсамола і клуб «Эксперымент» НДІ ПФП. У артыкуле даецца аб'ектыўная ацэнка мерапрыемства, якое патрэбна, на жаль, аднесці да разраду няўдалых. Арганізатарам з боку камітэта камсамола С. Сяргееву і А. Самуйлічу строга ўказана. Адказнасць нясе і клуб «Эксперымент». Асноўнай прычынай няўдачы з явілася наяўнасць некамплектнай апаратуры і недастатковая тэхнічная падрыхтаванасць арганізатараў з боку клуба. Камітэт камсамола нясе строгую адказнасць за тое, што не забяспечыў належнага кантролю за падрыхтоўкай і правядзеннем вечара.

Мы не робім скідку на тое, што ўпершыню ўзяліся за такую складаную справу, як «рынг». (Адзначым, што вечару папярэднічаў «рынг», які паспяхова прайшоў у лютым гэтага года ў клубе «Эксперымент»). Напярэдадні вечара адбылася рэпетыцыя, вядучыя падрабязна распрацавалі сцэнарый. Але для правядзення мерапрыемства ў ДК чыгуначнікаў імя Ільіча патрэбна была дадатковая апаратура, якая па віне камітэта камсамола была дастаўлена туды несвоечасова. Гэта з'явілася ці не галоўнай прычынай дрэннага выступлення груп (кожная з іх вымушана была выступаць амаль без падрыхтоўкі). Вядучыя таксама разгубіліся і не змаглі выправіць становішча, арганізаваўшы дыскусію».

«Фінал»

У № 18 АД 21 МАЯ 1987 ГОДА ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» БЫЎ ЗМЕШЧАНЫ АРТЫКУЛ КАРЭСПАНДЭНТА С. ГОГАЛЬ «ФІНАЛ», У ЯКІМ ІШЛА ГАВОРКА АБ ЗАКЛЮЧНАЙ ГУЛЬНІ КВЗ. АДКАЗВАЕ НАМЕСНІК САКРАТАРА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА ПА ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОЦЕ С. БАЛАШЭНКА:

«Артыкул «Фінал» быў абмеркаваны на пасяджэнні бюро камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна. Сакратару камітэта камсамола фізічнага факультэта І. Ганчаронку ўказана на недастатковую работу па падрыхтоўцы каманды факультэта.

Бюро камітэта камсамола лічыць неабгрунтаванымі словы В. У. Балашчанкі, якія прыведзены ў артыкуле: «Шкада, што практычна ўхіліўся ад КВЗ наш камітэт камсамола». Усе пытанні па падрыхтоўцы і правядзенню КВЗ вырашаліся членам камітэта камсамола, адказнай за маральна-эстэтычнае выхаванне М. Тарасавай і актывам камітэта».

«Ім не шанцуе»

ТАК НАЗЫВАЛАСЯ ЗАМЕТКА, АПУБЛІКАВАНАЯ Ў ГАЗЕЦЕ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» У № 19 ЗА 28 МАЯ 1987 ГОДА. У ЁЙ ІШЛА РАЗМОВА АБ ПАРУШЭННІ ПРАВІЛАЎ ДАРОЖНАГА РУХУ СТУДЭНТАМІ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА.

Інструктар камітэта камсамола А. Пухаў паведамляе, што сакратарам камітэтаў камсамола факультэтаў даручана разабрацца і прыняць меры ў адносінах да студэнтаў А. Люшкевіч і С. Заяц (журфак, 2 курс), А. Яршовай (фізфак, 2 курс), С. Багданавай (юрфак, 3 курс), Н. Антановіч (філфак, 4 курс).

СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ У ГРУПАХ

Увага: новы падыход!

«У гэтым годзе адзнакай па ГПА будзе з'яўляцца каэфіцыент грамадскай актыўнасці. Пры вызначэнні каэфіцыента ўлічваюцца: вучоба, навуковая і грамадская работа, удзел у СБА, уклад кожнага камсамольца ў агульную справу курса...»

Я СТАЯЎ перад аб'явай, якая вісела на механіка-матэматычным факультэце нашага універсітэта, праглядваў графік правядзення справаздачна-выбарных сходаў, прыкідваў, на якім лепш за ўсё папрысутнічаць.

— Не ведаеце, у якую групу схадзіць? — спытала дзячына, якая спынілася побач (відаць, звярнула ўвагу на маю фотасумку). Яна падышла бліжэй, кінула вокам на графік:

— Лепш за ўсё наведаць трэцякурснікаў, напрыклад, групу, дзе камсоргам Алег Аслёзаў. Сам ён кандыдат у члены КПСС, чалавек прынцыповы, сумленны, а група адна з лепшых на факультэце. Так што размова ў іх павінна атрымацца цікавая.

Потым я сядзеў на сходзе і здзіўляўся, што для студэнтаў так важна, будзе каэфіцыент 0,8 ці 0,9. Успамінаў, што яшчэ мінулай восенню кожны перад атэстацыяй спяшаўся «вывучыць» свой асабісты комплексны план (большасць з іх, як блізняты, былі падобныя адзін да другога), успамінаў, што ён там паабяцаў зрабіць. Што тады азначала адзнака паГПА? Амаль нічога. Бо была яна нейкая не «прывязаная» да спраў групы: «пяць» — дык «пяць», «чатыры» — таксама нядрэнна. Адзнаку ставіла камісія, а яна не ведала і не магла ведаць усіх магчымасцей студэнта, магла памыліцца.

— Зараз адмовіліся ад асабістых комплексных планаў,— ужо пасля сходу расказвае Алег Аслёзаў.— Ацэнку кожнаму камсамольцу дае ўся група. У сакавіку мы правялі анкетаванне. Кожны камсамолец усім, акрамя сябе, выставіў каэфіцыент грамадскай актыўнасці. Пасля падлічылі ўсе атрыманыя адзнакі, вывелі сярэднюю. Вынік атрымаўся вельмі цікавы: каэфіцыент грамадскай актыўнасці камсамольцаў групы вагаўся ад 0,2 да 0,9. Калі ўлічыць, што адзнаку выставілі твае таварышы, тыя, з кім ты пражыў разам амаль тры гады, можна ўявіць становішча камсамольцаў, якія атрымалі каэфіцыент 0,2.

Безумоўна, за гэтыя два месяцы яны зрабілі пэўныя вывады, змянілі свае адносіны да справы. І калі на сённяшнім сходзе яшчэ раз абмяркоўвалася дзейнасць кожнага камсамольца, то адзнакі былі ўжо значна вышэйшымі.

Зараз мы думаем, якая форма вызначэння каэфіцыента лепшая. Нягледзячы на ўсе перавагі ананімнага анкетавання, мяркуем, шчырая размова (калі таварышы гавораць пра твае недахопы прама ў вочы, калі адразу відаць, якім аўтарытэтам ты карыстаешся ў групе) усё ж лепш. Таму што гэта не проста «сухая» адзнака (хоць і яна прымушае задумацца). Гэта — сапраўдны арыенцір, канкрэтныя парады на будучае.

— Не ўсё атрымалася добра, так, як чакалі,— дзеліцца думкамі сакратар камітэта камсамола мехмата І. Краўчанка.— У некаторых групах аднесліся да сваіх таварышаў неаб'ектыўна.

Разам з тым сходы далі інфармацыю для роздуму. Напрыклад, камсорг 8 групы чацвёртага курса атрымала каэфіцыент грамадскай актыўнасці 0,3. Тут ёсць над чым задумацца не толькі ёй самой, але, безумоўна, і камітэту камсамола.

А вось для студэнтаў другой групы першага курса справаздачна-выбарны сход быў сапраўдным святам. Дзяўчаты прыйшлі на яго святочна апранутыя, з кветкамі. Хоць і першакурснікі, а мерапрыемства атрымалася, што лепш і быць не магло. Карацей, ёсць у каго пераймаць вопыт.

НА ЗДЫМКАХ: ідзе камсамольскі сход у 3 групе трэцяга курса механіка-матэматычнага факультэта; камсорг групы кандыдат у члены КПСС Алег Аслёзаў.

С. ПЛЫТКЕВІЧ.
Фота аўтара.

ФУТБОЛЬНЫ АГЛЯД

Чакаем цікавых гульняў

У БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЕ спаборніцтвы па футболу праходзяць на ўзроўнях ад першынства паміж групамі да ўдзелу у першынстве ВНУ. Што гэты від спорту жыве паспяхова ва універсітэцкай сям'і, пацвердзілі нядаўнія спаборніцтвы па міні-футболу паміж факультэтамі.

Барацьба была цікавай, хоць і магла быць яшчэ больш напружанай і вострай. З адзінацаці факультэтаў толькі 9 прынялі ўдзел у спаборніцтвах. Не змаглі давесці да канца пачатую справу мехматаўцы і біёлагі. Ці то ім надакучыла гуляць, ці не ўбачылі «дастойнага» саперніка, ці сіл не хапіла, але за няйўку на гульні каманды мехмата і біяфака былі зняты са спаборніцтваў. А ў пяцёрку мацнейшых увайшлі фізічны, факультэт радыёфізікі і электронікі, ФПМ, хімічны факультэт і факультэт журналістыкі (факультэты названы ў парадку занятых месц).

Галоўны суддзя сёлетняга першынства, трэнер зборнай БДУ па футболу В. Д. Ліштван падзяліўся некаторымі думкамі наконт футбольных спаборніцтваў:

— Лічу, што гульні прайшлі на больш высокім узроўні ў параўнанні з мінулым годам. Шмат там убачылі цікавых і перспектыўных як каманд, так і асобных футбалістаў. Але лідэры тыя ж: фізфак і радыёфізічны. Магу адзначыць каманду факультэта журналістыкі, якая выступіла ў амалоджаным саставе. Яе аснову склалі ігракі І курса. Па гэтай камандзе можна было бачыць, што ў нас ёсць рэзерв для футбольнай каманды БДУ. Сярод лепшых ігракоў я б адзначыў радыёфізікаў К. Еўдакімава, С. Ярмоліча, І. Паўловіча, В. Доўгага з фізічнага факультэта. Хачу заўважыць, што з нялепшага боку паказаў сябе юрыдычны факультэт. Была выстаўлена каманда з далёка не моцных ігракоў. Таму ўсіх вельмі здзівіла такое нізкае для юрфака 7 месца.

Але не толькі «ура» хочацца крычаць пасля універсітэцкага першынства. На жаль, былі ў спаборніцтвах моманты, якія ў пэўнай ступені знізілі агульнае ўражанне. Зноў не было ў многіх каманд сваёй формы, эмблемы, а значыць, не было «твару» факультэта. Не было амаль балельшчыкаў.

Чаму ўсё мы гаворым пра міні-футбол? Хіба ў «вялікі» ў БДУ не гуляюць? Гуляюць, але з таго часу, як пачалося будаўніцтва універсітэцкага спартыўнага комплексу, «вялікі» футбол стаў проста немагчымы. У такой ВНУ рэспублікі, як Белдзяржуніверсітэт, на сённяшні дзень няма стадыёна, дзе можна было б правесці гульні па футболу. Толькі ў 1989 годзе (будаўніцтва да гэтага часу мяркуюць завяршыць), пэўна, такая магчымасць будзе знойдзена. А пакуль В. Д. Ліштван мяркуе восенню гэтыя спаборніцтвы правесці ў Шчамысліцы:

— Калі дождж не перашкодзіць, бо яму без клопатаў удасца ператварыць поле ў месіва...

А. ПУЦІЛА.

ДА 70-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

Летапіс станаўлення

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 20, 21).

У лютым 1963 года пачалася вытворчая практыка студэнтаў. Першакурснікі накіроўваюцца ў рэдакцыі шматтыражных газет. У красавіку абаронены першыя дыпломы тагачасных студэнтаў. Выдатныя адзнакі атрымалі Д. Бяспалы, А. Казявін, У. Кузьмянкоў. Кіраўнікі — выкладчыкі Е. Л. Бондарава, М. Я. Цікоцкі, М. С. Зярніцкі. У маі гэтага года граматамі рэктарата і парткома ўзнагароджаны актыўныя карэспандэнты газеты «Беларускі універсітэт» Аляксандр Амельчанка і Георгій Огій.

У новым вучэбным годзе на першы курс паступіла 7 членаў і кандыдатаў у члены КПСС.

12 верасня адбыўся адкрыты партыйны сход філалагічнага факультэта, на якім абмяркоўваліся рашэнні чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС (1963 г.) і задачы партарганізацыі ў новым навучальным годзе.

5 кастрычніка група студэнтаў аддзялення журналістыкі прыступіла да выпуску чарговага нумара вучэбнай газеты «Журналіст», прысвечанага працаўнікам сельскай гаспадаркі Мінскага раёна. У ЛІСТАПАДЗЕ 1963 г. выйшла ў свет манаграфія Р. В. Булацкага «Ленінскай гвардыі салдат», а ў снежні — манаграфія М. С. Зярніцкага «Беларускі савецкі друк у гады ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны (1918—1920 гг.)».

10 СТУДЗЕНЯ 1964 ГОДА. Рэдакцыі газет і часопісаў рэспублікі наведалі студэнты-журналісты IV курса. Перад імі выступіў пісьменнік А. Кулакоўскі, член рэдкалегіі «ЛІМа», сатырыкі часопіса «Вожык» М. Пянкрат, В. Зуб, фельетаніст газеты «Чырвоная змена» Э. Калядзенка. Крыху пазней адбылася сустрэча з работнікамі газет, радыё і тэлебачання. Гасцямі былі карэспандэнт «Правды» А. Зенчанка, адказны сакратар Саюза журналістаў БССР А. Матусевіч, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанню БССР А. Бараноўскі і іншыя. У КАНЦЫ СТУДЗЕНЯ 1964 г. выйшаў з друку чарговы нумар вучэбнай газеты «Журналіст», падрыхтаваны студэнтамі другога курса аддзялення журналістыкі пад кіраўніцтвам выкладчыка А. В. Балаша. Нумар прысвечаны працаўнікам горада Салігорска.

18 СНЕЖНЯ адбылося чарговае пасяджэнне студэнцкага навуковага гуртка. Абмяркоўваліся даклады студэнта II курса А. Градзюшкі «Фотарэпартаж у маладзёжнай газеце» і студэнткі IV курса І. Гурыновіч «Майстэрства журналіста» (па кнізе В. Пяскова «Крокі па расе»).

У ПАЧАТКУ СТУДЗЕНЯ 1965 ГОДА адбылася сустрэча студэнтаў аддзялення з супрацоўнікамі выдавецтва ЦК ВЛКСМ «Молодая гвардия». Паэты і празаікі выдавецтва вялі гутарку аб творчасці, чыталі свае творы.

24 ВЕРАСНЯ 1965 ГОДА. Дзень замацавання народжанага сяброўства са студэнтамі Львоўскага ордэна Леніна дзяржаўнага універсітэта імя І. Франко. З дакладамі на навуковай канферэнцыі па праблемах тэорыі і гісторыі публіцыстыкі выступілі дацэнты Р. В. Булацкі, М. Я. Цікоцкі, Е. Л. Бондарава.

У ПАЧАТКУ ЛІСТАПАДА сабраліся на канферэнцыю па падвядзенню вынікаў вытворчай практыкі студэнтаў. Прысутнічалі супрацоўнікі кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку і гісторыі журналістыкі, работнікі друку, радыё і тэлебачання.

19 ЛІСТАПАДА перад студэнтамі выступалі паэты і празаікі РСФСР, Украіны, Латвіі, Эстоніі.

1 ВЕРАСНЯ 1967 ГОДА. На базе філалагічнага факультэта створаны факультэт журналістыкі.

З ЛІСТАПАДА 1967 ГОДА на факультэце адбыўся дыспут па кінафільму Сяргея Герасімава «Журналіст». Арганізатарам яго была дацэнт Е. Л. Бондарава.

У СНЕЖНІ прайшла сустрэча студэнтаў з уласным карэспандэнтам АДН па Беларусі І. М. Мухінай.

19 СНЕЖНЯ першакурснікі сустрэліся з рэдактарам выдавецтва «Беларусь» пісьменнікам А. М. Марціновічам.

25 СНЕЖНЯ кафедра радыё і тэлебачання факультэта журналістыкі арганізавала экскурсію на Беларускае радыё. Ініцыятарам быў Я. Р. Радкевіч.

28 ЛЮТАГА 1968 ГОДА адбыўся партыйны сход факультэта. На парадку дня пытанне: «Роля камуністаў у грамадскай рабоце на факультэце». Спрэчкі вяліся гарачыя. Выступіла 12 чалавек.

5 МАЯ на факультэце па традыцыі сустрэліся выпускнікі розных гадоў.

17 КАСТРЫЧНІКА адбылася сустрэча з рэдактарамі раённых газет. У госці да студэнтаў прыйшлі выпускнікі: рэдактары лідскай і маладзечанскай раённых газет «Уперад» і «Святло Кастрычніка» А. Богуш і Б. Пернікаў, намеснік рэдактара іўеўскай раённай газеты «Шлях Ільіча» А. Бяспалы. Атрымалася цікавая размова аб рабоце ў раённым друку.

28 КРАСАВІКА 1969 ГОДА адбыліся ўрачыстасці з нагоды святкавання 25-годдзя адкрыцця факультэта журналістыкі.

1970 ГОД. КАСТРЫЧНІК. Адбыўся партыйны сход факультэта. З дакладам «Аб ходзе выканання абавязацельстваў, узятых у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» выступіў намеснік дэкана А. І. Раковіч. У спрэчках выступілі 5 чалавек. Яны ўнеслі шэраг канкрэтных прапаноў па падрыхтоўцы і дастойнай сустрэчы ленінскага юбілею.

15 СТУДЗЕНЯ 1971 ГОДА на факультэт была запрошана народная артыстка СССР В. Артмане.

15 САКАВІКА 1971 ГОДА адбыўся партыйны сход, на якім ішло абмеркаванне пытання аб выкананні абавязацельстваў, узятых у гонар XXIV з'езда КПСС і 50-годдзя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Сход канстатаваў: супрацоўнікамі падрыхтавана 20 навуковых работ, падрыхтаваны і абаронены 4 кандыдацкія дысертацыі, скончылі працу над доктарскімі Р. В. Булацкі, М. Я. Цікоцкі. Факультэт выйшаў на першае месца ва універсітэце па паспяховасці.

25 МАЯ 1972 ГОДА па выніках агляду насценных газет 1-е месца прысуджана насценнай газеце «Журналіст».

У маі гэтага года па выніках рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ 14 нашых студэнтаў атрымалі дыпломы: I катэгорыі — 4 чалавекі, II — тры, III — 7 чалавек.

СТУДЗЕНЬ, 1973 ГОД. Адбыўся адкрыты партыйны сход факультэта журналістыкі. У пастанове сходу адзначалася, што на працягу 1972 года супрацоўнікамі факультэта было надрукавана ў розных выданнях 68 навуковых даследаванняў і артыкулаў. У іх ліку — манаграфіі Р. В. Булацкага і І. І. Сачанкі «Кузьма Чорны — журналіст-публіцыст», А. І. Наркевіча «Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове». У гэты ж час студэнты факультэта прынялі актыўны ўдзел у навуковых канферэнцыях Маскоўскага, Львоўскага і іншых універсітэтаў, Львоўскага паліграфічнага інстытута і паспяхова выступілі з дакладамі.

24 КРАСАВІКА 1975 ГОДА. Зноў увага партыйнай арганізацыі накіроўваецца на навукова-даследчую работу студэнтаў. На партыйным сходзе выступіла член партбюро Е. Л. Бондарава. На факультэце працуюць пяць гурткоў, у якія ўваходзіць 120 студэнтаў.

29 МАЯ агітбрыгада факультэта (кіраўнік — старшы выкладчык М. Р. Каваленка) выступіла перад працаўнікамі Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. У трэцім працоўным семестры гэтага года выдатна працаваў атрад студэнтаў факультэта ў саўгасе імя Тэльмана. Яго байцы былі ўзнагароджаны граматай дырэкцыі саўгаса.

14—16 КАСТРЫЧНІКА 1975 ГОДА на факультэце адбылося пасяджэнне навукова-метадычнага савета па журналістыцы, створанага пры МінВНУ СССР. Госці падрабязна азнаёміліся з арганізацыяй вучэбнага працэсу, навукова-даследчай работы выкладчыкаў і студэнтаў.

З дакладамі выступілі дэканы факультэтаў журналістыкі МДУ імя Ламаносава Я. М. Засурскі і БДУ імя У. І. Леніна Р. В. Булацкі, дацэнт Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК КПСС Я. В. Марозаў, а таксама прадстаўнікі Ленінградскага, Кіеўскага і Уральскага універсітэтаў.

1979 ГОД. Стала добрай традыцыяй у слухачоў падрыхтоўчага аддзялення факультэта ў працэсе вывучэння твораў класікаў беларускай літаратуры наведваць музеі, мясціны, якія звязаны з жыццём і дзейнасцю дзеячаў беларускай культуры.

У 1980—81 ВУЧЭБНЫМ ГОДЗЕ ў спаборніцтве універсітэта факультэт журналістыкі заняў першае месца, яму быў уручаны пераходны Чырвоны сцяг.

Р. БУЛАЦКІ,
прафесар.

Да сустрэчы

УСЁ БОЛЬШ упартым у сваім маўчанні становіцца рэдакцыйны тэлефон; так, калі не тэлефануюць нам, возьмем даведнік у рукі і паспрабуем «павылаўліваць» распаўсюджвальнікаў — зноў газеты едуць на факультэты, быццам на перакладных. Зразумела — сесія, канцэнтрат думак, хваляванняў, бяссонных начных гадзін, метраў і кіламетраў кніжных радкоў, канцэнтрат спецыфічны, пазбаўлены вольнага часу і прамінаду па гораду і магазінах. Сесія — гэта яшчэ эпілог навучальнага года, пасля якога нас чакае шчаслівая магчымасць з усёй паўнатой адчуць прыгажосць доўгачаканага лета. Якім будзе лета? Багатым на незвычайныя падзеі, шчырыя адкрыцці, цікавыя знаходкі? Так! Якое ж лета без гэтага?!

А пакуль мы развітваемся з вамі, паважаныя чытачы. Да сустрэчы у новым навучальным годзе!

Пасадка

ЗОРКАЛЁТ, пажыраючы чарговую порцыю паліва, ішоў на пасадку. Адказваючы на пытанні камп'ютэра, Гары Мыкін у думках ступаў па пыльнай, з'едзенай кратэрамі-воспінамі паверхні Месяца. Колькі такіх пасадак было ў Мыкіна... Але заўсёды апошнія секунды перад Сутыкненнем хвалявалі яго, як і ў самы першы раз.

Ён добра памятаў той першы...

...Тады яму пашанцавала. Абышоўся сатрасеннем... Сябры называли яго шчасліўчыкам. Марына адарыла чароўнай усмешкай, а ўвечары яны пайшлі ў «Цэнтральны» глядзець старую добрую казку пра сталкераў...

Мыкін зірнуў на экран. Паліва было на зыходзе. Хуткасць імкліва расла.

...Так, ён быў шчасліўчыкам. Быў... Учора ён бачыў яе з другім.

Гары Мыкін кінуў камп'ютэру апошняе паліва і заплюшчыў вочы. Ён уявіў, як, нястрымна несучыся, карабель пранізвае велізарную жоўтую мішэнь у самую дзесятку.

Экран свяціўся паведамленнем:

— НА ПАВЕРХНІ МЕСЯЦА УТВАРЫЎСЯ НОВЫ КРАТЭР...

Гары Мыкін выйшаў з дысплейнага пакоя пакурыць.

У «ЛІФЦЕ» удзельнічалі: фельетон прынёс А. МАКСІМАЎ, інтэрв'ю правяла С. ГОГАЛЬ, фантастычнымі сюжэтамі захапляецца У. МАЛЮГІН, дзённік таракана выявіў С. СУЛКОЎСКІ, афармленне выпала В. ЯЦКОЎСКАМУ. Дзяжурыла А. ВІХРОВА.

ШТО БЫЛО СПАЧАТКУ? ФЕЛЬЕТОН ЦІ ІНТЭРВ'Ю? Інтэрв'ю ці фельетон? З'явіліся яны ў нашай рубрыцы адначасова. У фельетоне, як вы даведаецеся, закрапуты здаць у макулатуру унутранага распарадку інтэрната, які ашуканыя ахоўнікамі надзяляюць сябе іншыя вахцёры. І што з гэтага атрымліваецца.

У другім матэрыяле (папярэджаны «сумарыстычным») гаворка пойдзе пра новае палажэнне аб [illegible] унутранага распарадку пражывання ў інтэрнатах. Дзякуючы, надзейнаму кацыю гэтых дакументаў з буку адміністрацыі знікне «другога дома» больш не будзе.

Зацверджана палажэнне аб студэнцкіх інтэрнатах і правілы унутранага распарадку ў інтэрнатах Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

На пытанні нашага карэспандэнта С. ГОГАЛЬ адказвае Г. У. ПАЦЁКІН, намеснік старшыні прафкома студэнтаў па жыллёва-бытавой рабоце.

Дзённік таракана

01.04.87. Нарэшце прыйшоў Новы год. Мае пастаяльцы задаволены. Усю ноч не спалі. Весяліліся. На Новы год мне падарылі шмат хлебных крошак...

15.01.87. Мае студэнты ўсё мараць пра новы будынак для факультэта. «З раскошы шалеюць»,— падумаў я. Напрыклад, мне — вельмі хораша ў вуглу тумбачкі...

10.02.87. Зноў усю ноч не спалі. Сядзелі над кніжкамі. У іх нейкая «сесія». Галадаюць. Хлеб не купляюць ужо чацвёрты дзень. Канспектам выпадкова прыбілі малодшага брата. Не магу заснуць пры святле...

10.03.87. Вяртаюцца позна. Лаюць нейкі хор. Лямантуюць на ўвесь пакой. Трэніруюцца, напэўна. Аглушыл жонку майго сябра. У людзей хутка нейкі агляд. Будуць спяваць. Яны не жадаюць. Гэтак і трэба гэтым людзям!..

20.03.87. Сёння ў маіх дзень дублёра. Спадабалася. Нават купілі нечага. Трэці месяц гутараць пра самакіраванне. Спытаў ў мамы, яна сказала, што летась таксама гаварылі. «Наіўныя»,— падумаў я, засынаючы...

1.04.87. Людзі вельмі вясёлыя. Усе смяюцца. Увечары зноў лаялі наргас. Потым буянілі. Папала і нашым. Чацвёра прапалі без вестак. Адзін паляцеў з сёмага паверха.

10.04.87. Тумбачкі і халадзільнік зноў пустыя. Быццам яны шмат прапусцілі заняткаў і стыпендыю не атрымалі. А мяне гэта не хвалюе. Я есці хачу. Сястра ад голаду навучылася есці сала.

10.04.87. Чакаюць стыпендыю. Лаюцца, што яе мала. Асабіста мне на крошкі хапае. «Праглыты, сорак рублёў ім мала,— падумаў я. Напэўна, я не правы. Бо тата вучыў, што чым большая стыпендыя, тым сытнейшыя тараканы».

20.04787. Прачнуўся рана. Студэнты мае праспалі першую «пару». Ляжаць. Зноў загаварылі пра нейкае вольнае наведванне лекцый. «Памараць і перастануць»,— філасофскі заўважыў я. Увечары замучылі цёшчу майго брата. Напэўна, зло зганялі.

28.04.87. Вучыцца перасталі. Ходзяць на хор. Спяваюць нават у сне пра нейкую лодачку. Скардзяцца на недахоп мерапрыемстваў. Нарэшце справілі мерапрыемства: разам утапілі ў ваннай непаўналетняга сябра маёй сястры...

5.05.87. Нарэшце яны сваё адспявалі. Прыйшлі позна. Марылі пра дні журналіста на сваім факультэце. «Перабʼюцца!» — падумаў я. Марыць не шкодна...

8.05.87. Усе бегаюць, мітусяцца, робяць газету. Перапісвалі разоў пяць. Прыходзілі нейкія ў белых халатах. Папырскалі ўсе пакоі. Гэта завецца «дэзінфе́кцыя». Шмат нашых загінула. Выпадкова загінуў у кіпячым чайніку мой лепшы сябра. Я выжыў.

11.05.87. Людзі зноў атрымалі нагаяй за газету. І мяне радуе гэта.

13.05—...05.87. Мараць пра новы будынак для факультэта, гавораць пра самакіраванне і дублёрскі дэканат, фантазіруюць пра вольнае наведванне лекцый, уяўляюць сабе дружбу з наргасам, настройваюцца на практыку ў добрых газетах, уносяцца думкамі ў правядзенне мерапрыемстваў, не стамляюцца паўтараць пра згуртаванне калектыву, мяркуюць пра спагадлівых выкладчыкаў... «Якая ж багатая людская фантазія»,— падумаў я. «Абянанага тры гады чакаюць»,— заўважыў мой сябра.

Гэта ўжо мой апошні запіс. Бывайце! Не ўспамінайце ліхам...

Эксперымент з аўтаніпаў

ФЕЛЬЕТОН

ВЕДАЎ я аднаго знаёмага, які не аднойчы мне даверліва казаў: «Люблю блытаніну». Не! Не падумайце нічога такога — ён не быў вар'ятам, проста любіў назіраць, як штосьці не атрымліваецца ў людзей, ідзе не так, як трэба, і гэта яго вельмі цешыла. Ад задавальнення ён аж рукі паціраў... На жаль, у нас яшчэ ёсць частка такіх вось «чалавечкаў», якія шмат чаго зауважаюць, але нічога не робяць для паляпшэння справы. Кажуць прыкладна так: «Навошта? Можа, хай усё так і застаецца, лягчэй нам жыць без лішняга пакою».

І асабліва любіў гэты знаёмы, калі быў у інтэрнаце № 2, затрымлівацца каля вахты. Не раз зауважаў, спыніўшыся і радасна назіраючы, як вахцёр прафесійна ўпраўляецца вачыма ў чарговую сваю «ахвяру»:

— Пропуск!

— У мяне тут сябра, дазвольце...

— Чакайце! Трэба выклікаць.

Нічога іншага не застаецца, як клікаць то да аднаго, то да другога вахцёра і маліць таго, каб паклікалі патрэбнага чалавека. На шчасце, свет яшчэ не зусім без добрых людзей, хтосьці абавязкова згодзіцца гэта зрабіць. І ад радасці забываеш тады пра маруднае чаканне, патрачаны дарэмна час. Але гэта — у лепшым выпадку... Калі пашанцуе.

Заўважаў такое мой знаёмы, пасмейваўся і, між іншым, паказваў на два бакі аднаго медаля ў існуючай недакладнай прапускной сістэме. Праходзячыя дзівіліся на тых, хто выпрабоўваўся цярпеннем у чаканні каля вахты, і тых, хто спакойна праходзіў, паклаўшы толькі свой пропуск. У асноўным да другой, «прывілейнай» часткі адносіліся замежныя студэнты.

Так было шмат гадоў. І часта, гаворачы пра гэта і патрабуючы рашучых змен, умудрыліся сцерці сабе языкі аб зубы. Але ўведзеная сістэма працягвала жыць. Горка жартавалі, што ў пачатку хацелі толькі паспрабаваць, які з варыянтаў апраўдае сябе лепш, каб яго потым і пакінуць, ды так і забыліся.

Гаворкі — гаворкамі, але атрымаўся нікім не прадугледжаны і нідзе пакуль што не зафіксаваны афіцыйна эксперымент.. з блытаніной. На жаль, жыхарам ад гэтага лепш не стала. Яго вынікі, якія даволі зацягнуліся, бачаць усе, як і тое, што пачуцці каля вахты кіпяць, не ўступаючы па напружанасці фінальным футбольным спаборніцтвам. Але з той толькі розніцай, што тут амаль заўсёды выходзіць пераможцам варатар, прабачце, вахцёр. Літара закону на яго баку. Праўда, калі-нікалі і ён атрымлівае «гол» і яго абарону прарываюць настойлівыя наведвальнікі. Але бабулькам, што сядзяць на вахце, вытрымкі не займаць. А вынікі нязменна адзіныя: сапсаваны настрой, непрыемныя для абодвух бакоў абразы, грубасць, нават слёзы. І шмат хто ставіў пытанне: з чаго ж гэта столькі шуму, дзе яго якраз і не павінна быць? Самым нястрыманым і гарачым звыкла і нудна тлумачылі, што загад ёсць загад, што пакуль яго...

Цяпер, на шчасце, усё ж перагледзелі. Стала дастаткова як быццам паказаць свой дакумент — і праходзь, калі ласка...

Проста? Так! Толькі хутка справа гаворыцца, ды марудна робіцца. Ва ўсякім выпадку у інтэрнаце № 2 па-ранейшаму вахту асаджае шмат жадаючых сустрэцца з сябрамі, знаёмымі. І хоць кажуць студэнты пра змяненні, на вахце чуецца ўсё тое ж:

— Выклікайце!

Так што пакуль аматар ералашу працягвае цешыцца з другіх, прыгаворчаючы: «Люблю блытаніну, хоць ёсць з чаго парагатаць».

А табе смешна, чытач?

Вялікі дом, дзе ты жывеш

— ГЕНАДЗЬ УЛАДЗІМІРАВІЧ, У ПРАФКОМЕ СТУДЭНТАЎ ІМЕННА ВЫ АДКАЗВАЕЦЕ ЗА УНІВЕРСІТЭЦКІЯ ІНТЭРНАТЫ. НА ЯКІЯ МОМАНТЫ НОВАГА ПАЛАЖЭННЯ АБ ІХ ВАМ ХАЦЕЛАСЯ Б ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ ЧЫТАЧОЎ-СТУДЭНТАЎ?

— Я хачу напомніць, што загад рэктара адмяніў старое палажэнне, зацверджанае ў 1968 годзе. Інтэрнаты прызначаюцца для размяшчэння іншагародніх студэнтаў, аспірантаў, слухачоў ПА, замежных грамадзян. Студэнцкія інтэрнаты знаходзяцца ў падпарадкаванні адміністрацыі, прафкома студэнтаў і камітэта камсамола БДУ.

Што датычыць правоў пражываючых у інтэрнаце, то хачу сказаць: студэнты павінны не толькі іх ведаць, але і ўмела імі карыстацца. Яны могуць карыстацца ўсімі памяшканнямі інтэрната, патрабаваць своечасовай замены абсталявання, мэблі і г. д., выбіраць студсавет і ўдзельнічаць у жыцці інтэрната.

Нельга забывацца і на абавязкі: строга выконваць правілы ўнутранага распарадку, беражліва адносіцца да памяшкання, у якім жывеш і г. д.

— ГЕНАДЗЬ УЛАДЗІМІРАВІЧ, ЗАГАД РЭКТАРА ЗАЦВЕРДЗІЎ І НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ЎНУТРАНАГА РАСПАРАДКУ. ЯКІЯ ІХ АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ?

— Унутраны распарадак у нашых інтэрнатах даўно хваляваў студэнтаў і нас. Новыя правілы накіраваны на забеспячэнне правапарадку ў інтэрнатах і стварэнне спрыяльных умоў жыцця студэнтаў.

Дазваляецца вечары адпачынку, калі патрабуюць музычнага суправаджэння вышэй сярэдняга ўзроўню гучнасці, праводзіць у святочныя і выхадныя дні, а заканчваць яны павінны не пазней 23 гадзін.

Для ўваходу ў інтэрнат кожнаму студэнту выдаецца пропуск. Калі ён губляецца, то студэнт атрымлівае вымову.

Уваход у інтэрнаты універсітэта чужым асобам — з дазволу адміністрацыі або студсавета з 8 гадзін раніцы і да 23 гадзін. Пры ўваходзе наведвальнікі пакідаюць дакумент, рэгіструюцца ў журнале наведвальнікаў. Адказнасць за тое, каб своечасова наведвальнік пакінуў інтэрнат, выконваў унутраны распадарак, нясе той, да каго прыйшоў наведвальнік.

Новыя правілы забараняюць пражываючым у інтэрнаце самавольна перасяляцца з пакоя ў пакой, карыстацца электрапрыборамі ў жылых памяшканнях, пакідаць чужых асоб на начлег без ведама студсавета, з'яўляцца ў нецвярозым стане, курыць у памяшканнях інтэрната, акрамя спецыяльна вылучаных месц.

— ШТО НОВАГА Ў НОВЫХ ДАКУМЕНТАХ? ЧЫМ АДРОЗНІВАЮЦЦА ЯНЫ АД ПАПЯРЭДНІХ?

— Пашыраюцца правы студсаветаў. Калі раней у вырашэнне пытанняў засялення ў інтэрнат умешвалася дырэкцыя студгарадка, то цяпер гэтыя пытанні поўнасцю будзе вырашаць студсавет і прафком. Больш строгія меры будуць прымацца да парушальнікаў унутранага распадарку: цяпер іх будуць не толькі высяляць, але і выключаць з універсітэта. І яшчэ: месца за студэнтам, які пайшоў у акадэмічны адпачынак, захоўваецца за ім і можа быць выкарыстана толькі пасля ўзгадзення са студэнтам.

Думаю, што студсаветы ў першую чаргу павінны звярнуць увагу на гэтыя дакументы і пастарацца, каб яны былі правільна выкананы. Нельга забываць, што ніводны дакумент не ажыве, калі не будзе праяўлена ініцыятыва. Кожны лепш прымяніць узаконеныя правы, дамагчыся лепшага выканання абавязкаў — над гэтым трэба думаць на месцах.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВП імя Я. Коласа.
Зак. 1586.
18 чэрвеня 1987 г.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ.